таксама пераважна ў афармленні прыватных камерных інтэр'ераў. В.ж. вывучаюць у Бел. акадэміі мастацтваў. *І.Л.Чэбан.*

**ВАСКО́ЎСКІ** Міхаіл Васілевіч (н. 19.10.1950, в. Ільінка Талачынскага р-на), беларускі народны майстар у галіне керамікі. Скончыў Бабруйскае маст. ПТВ (1974). З 1975 працаваў мастаком-керамістам на Мазырскай ф-цы маст. вырабаў. З 2005 кіраўнік гуртка «Жывая гліна» пры Цэнтры



*М.Васкоўскі. Сувенірныя кубкі. 1990-я гг.*

дзіцячай творчасці ў г. Мазыр. Распрацоўваў узоры-эталоны дробнай пластыкі утылітарна-дэкар., маст. і сувенірнага прызначэння для масавага ўжытку. Творы вызначаюцца вастрынёй характарыстык персанажаў, дакладнасцю адлюстравання побыту, гумарыст. характарам. Удзельнік і прызёр многіх выставак, конкурсаў, фестываляў нар. творчасці. *Я.М.Сахута.*

**ВАСЬКАВІЦКІ НАРО́ДНЫ АНСА́МБЛЬ НАРО́ДНАЙ ПЕ́СНІ «ЧАПУ́РУШКІ».** Створаны ў 1994 у в. Папоўка Слаўгарадскага р-на пры Васькавіцкім сельскім клубе. У 2005 прысвоена званне «народны аматарскі калектыў». Кіраўнікі: С.В.Лук'яненка (з 1994), Г.С.Малахоўская (з 2001). У складзе ансамбля 12 чал. ва ўзросце ад 30 да 45 гадоў. Асн. мэты дзейнасці — прапаганда бел. нац. традыцый, вак. мастацтва. У рэпертуары бел. нар. песні («У зялёную дуброву», «І туды гара», «З-пад каменя», «Ляснік»), творы бел. кампазітараў («Беларусь» М.Захарчанкі, «Хлеб ды соль» Л.Захлеўнага, «Чарнобыльскі шлях» В.Войціка, «Цякла рэчка» М.Алешкі, «Прывітальная» В.Кісцені і інш.). Калектыў — дыпламант абл. фестывалю сямейнай творчасці «Сузор'е талентаў» (г.п. Глуск, 2007), удзельнік рэсп. фестывалю-кірмашу «Дажынкі» (г. Бабруйск, 2006), раённага тура ў межах усебел. фестывалю нар. мастацтва «Беларусь — мая песня» (г. Слаўгарад, 2005) і інш. *Г.І.Селядкова.*

**ВАСЬМІРАДКО́ВІК,** від нерыфмаванага верша, які складаецца з 8 радкоў, завершаных па сэнсе і рытміка-інтанацыйнай структуры. Яму ўласцівы філасафічнасць, медытатыўнасць, прытчавасць і афарыстычнасць. В. складаецца з 2 сэнсавых частак: 1-я — разгорнуты эмацыянальна-лагічны, вобразны тэзіс; 2-я — выснова афарыстычнага, прытчавага характару, створаная ў форме антытэзіса, паэт. парадокса. Колькасць радкоў у 1-й і 2-й частках можа спалучацца 2 спосабамі: 6—2 і 4—4 (2 катрэны).

Усё мае працяг жыцця:
Нітка — у туга навітым клубку,
Дарога — у імкненні за небасхіл,
Песня — у водгаласах рэха,
Зерне — у хлебе надзёным,
Любоў — у сонечнай усмешцы
дзіцяці.
Усё мае свой працяг жыцця,
Апроч няпраўды. (М.Танк)

В. сустракаецца ў творчасці Я.Купалы («О так! Я — пралетар!..»), М.Танка («Я спытаў чалавека...», «Па тым, як нашы рэкі дыхаюць хвалямі...», «Праўда», «Не сарваная з дрэва лістота»), А.Пысіна («Прамільгнуць далёкія свяцілы...»), Н.Гілевіча («Як чараўніца на нябачных кроснах») і інш. Разнавіднасці В. — цвёрдыя вершаваныя формы: *актава, трыялет, сіцыліяна.* *І.М.Гоўзіч.*

**ВАСЬМІРАДКО́ЎЕ,** а к т э т, страфа, якая складаецца з 8 вершаваных радкоў, з сэнсавай, кампазіцыйнай, інтанацыйна-рытмічнай завершанасцю і ўпарадкаванасцю рыфмы. У В. радкі рыфмуюцца рознай колькасцю рыфм: адной, дзвюма, трыма, чатырма. Напр., у вершы А.Куляшова «Калі каханне абвянчае...» выкарыстоўваюцца 3 рыфмы:

Калі каханне абвянч**ае**
Жаданай згодай малад**ых**,
Свайго сумлення не хав**ае**
Яно ад позіркаў чуж**ых**.
А звяжа шлюбам малад**ая**
Сябе з нялюбым і стар**ым**,
Свайго сумлення не схав**ае**
Яна за прозвішчам чуж**ым**.

Упершыню В. ў бел. паэзіі выкарыстаў Сімяон Полацкі ў вершы «Стиси краесогласнии ко пресветлейшему самодержавнейшему велнкому государю царю н велнкому князю Алекснго Михайловичю...». Сустракаюцца В. ў творах В.Дуніна-Марцінкевіча («Гапон», «Верш Навума Прыгаворкі»), Ф.Багушэвіча («Дурны мужык, як варона», «Мая хата» і інш.), Я.Лучыны («Што думае Янка, везучы дровы ў горад»), а таксама ў бел. паэзіі 20—21 ст. (М.Танк, А.Куляшоў, П.Броўка, Р.Барадулін, Г.Бураўкін, Н.Мацяш, Я.Сіпакоў і інш.). Цыкл «Васьмірадкоўі апошніх пацалункаў» стварыла Р.Баравікова (зб. «Дрэва для райскай птушкі», 2007). *І.М.Гоўзіч.*

**ВАСЬМЯРЫК** у а р х і т э к т у р ы, васьмівугольны ў плане будынак або яго частка. Як выразная маст. архіт. форма на аснове больш трывалай прасторавай структуры атрымаў пашырэнне ў архітэктуры жылля, грамадскіх і культавых пабудоў. У Беларусі ў 15—18 ст. у форме В. будавалі абарончыя вежы («круглікі») гар. умацаванняў і замкаў (гарады Віцебск, Полацк), званіцы (в. Дудзічы Пухавіцкага р-на), капліцы (Мінск), касцёлы (г. Шклоў), культавыя збудаванні (*Смаргонскі кальвінскі збор*). У 16—19 ст. шырока выкарыстоўваліся камбінаваныя формы В. і чацверыка (*Мірскі замкавы комплекс, Любчанскі замак, Заслаўская Спаса-Праабражэнская царква,* званіца ў в. Рубель Столінскага р-на). У 17—18 ст. форма В. пашырылася ў драўляным дойлідстве для стварэння выразнай сілуэтнай кампазіцыі пры чаргаванні В. і чацверыкоў у вежах храмаў (*Рубельская Міхайлаўская царква, Кажан-Гарадоцкая Мікалаеўская царква* і інш.). У 20 ст. павароты паверхняў В. эфектна выяўлялі святлоценявыя моманты архіт. кампазіцыі (будынак абкома КПБ у Мінску). Эстэтычнае